

# Юля МІХНО

## ВЫ НА МЯНЕ ГЛЯДЗІЦЕ ПРАЗ ГАДЫ

*Эсэ*

Мой дзядуля, мой прадзед. Гэтыя словы я чую, калі на экране тэлевізара з'яўляюцца старыя фотаздымкі і вядамыя ў нашай краіне людзі расказваюць пра сваіх блізкіх, што ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мне захацелася даведацца пра сваіх продкаў. Звярнулася да бабулі. Яна спачатку адказала, што мае прадзеды былі ў тыя трагічныя гады яшчэ падлеткамі, але пасля дастала з кніжнай шафы стары альбом і сказала: "Гэта добра, што ты хочаш ведаць пра іх, бо мінулая вайна не абышла ні адзін дом, ні адну сялянскую хату, а боль ваенных нягод добра вядомы кожнай беларускай сям'і, зведалі яго і твае прадзеды." Яна пачала гартаць альбом, а я глядзела на пажоўклыя фотаздымкі і слухала бабулін аповед пра іх лёс.

Мой прадзед Кандрат быў падлеткам, калі пачалася вайна. Яго разам з многімі хлопцамі і дзяўчатамі вывезлі ў Германію, дзе ён быў парабкам у адной нямецкай сям'і. Ён працаваў ад цямна да цямна, праўда, яго не білі, але начаваў ён у хляве разам з жывёлай. Калі Савецкая Армія ўвайшла ў Германію, прадзеда немцы адпусцілі. Ён пехатой вярнуўся дадому, а тут адразу быў накіраваны ў фільтрацыйны лагер, пакуль правяралі дакументы. Потым ён служыў у арміі.

Прадзед Фёдар, як і іншыя падлеткі яго ўзросту, быў забраны немцамі і накіраваны ў школу для паліцаяў. Падлеткаў тады пахапалі нечакана,

перакладчык усім тлумачыў, што калі яны будуць супрацíўляцца, то расстраляюць і іх, і сем'і. Але, як толькі іх прывезлі ў нейкі трохпавярховы будынак (яшчэ нават не паспелі высветліць і пазапісваць хто з іх хто і адкуль), Фёдар падабраўся да акна і скочыў з другога паверха. Усе думалі, што ён забіўся. Немцы, відаць, не палічылі патрэбным займацца нябожчыкам - хапала клопату і з жывымі. Улучыўшы момант ён адпоўз, хоць і моцна пакалечыўся, але ноччу змог дабрацца дамоў. Доўгі час сям'я жыла ў страху, што яго будуць шукаць, хавала і лячыла, як магла, бо звярнуцца па дапамогу было небяспечна.

А вось прапрабабулю Надзю немцы вялі нават на расстрэл. Знайшоўся здраднік ў суседняй вёсцы, які данёс немцам усё пра мясцовых людзей: хто быў актывістам пры савецкай уладзе, у каго дзеці ваююць на фронце, а ў Надзі сястра жыла ў Маскве. Усіх гэтых ворагаў нямецкай улады і вялі на смерць. Людзі толькі маліліся і больш нічога. І нешта раптам здарылася. Нямецкі афіцэр даў знак канваірам, і яны хуценька селі ў машыну і кінулі гэтых напалоханых і разгубленых людзей. Вось так Надзя, мая прапрабабулька, выратавалася ад смерці. "Відаць, па волі Божай,"- заўсёды гаварыла яна, калі расказвала пра тое нечаканае збавенне і згадвала, што ў суседняй вёсцы з-за таго даносчыка некалькі чалавек расстралялі. Яна пражыла 92 гады, многа пабачыла, многа расказвала, каб мы ведалі і памяталі.

Я глядзела на старыя фотаздымкі і думала пра тое, колькі страху за свой лёс, жыццё сваіх родных і блізкіх, за сваю зямлю нацярпеўся наш народ. Дык ці можам мы забыцца на ўсё гэта! Пройдуць гады, але мы гэтую памяць будзем перадаваць сваім дзецям і ўнукам. Калі мы ведаем пра сваіх продкаў, то і нашчадкі павінны гэта ведаць.

Юля Міхно, вучаніца 11 "Л"
класа гімназіі № 2 г. Гродна